Гэнік Лойка



...Я за тое, каб шчыра ў вочы казаць:
калі ты не гаворыш па-беларуску,
то ты не беларус.
І не называй сябе беларусам...

# Мы ўкручаныя ў стварэньне

***Гутарка Галіны Дубянецкай з Гэнікам Лойкам***

***Гэнік Лойка запомніўся з маладзёвых ігрышчаў 1980-х: лёгкі бялявы "вершнік" на карку мажнейшага хлопца-"каня", насупраць падобнай "коннай" пары падчас гульні ў "Грунвальд". Немалую ролю ў тых імпрэзах мела ўсялякая сьвяточная атрыбутыка: ці то саламяная птушка на гуканьне вясны, ці ліхтарыкі з бляшанага лісьця папараці на Купальле, ці то зорка, з якой хадзілі калядоўшчыкі да Караткевіча ды іншых добрых людзей… Усё гэта выдумляў і вырабляў Гэнік-мастак, ад першых сьпевак удзельнік усіх чынаў "Майстроўні", а пасьля "Талакі". А Гэнік-танцор уплываў на дзявочыя настроі: "Гэнік прыйдзе". – "Ура! Танчыць будзем!" Альбо: "Давайце танчыць!" – "Куды? Бяз Гэніка?…" А з чые ласкі ў рэпертуар "Талакі" ўвайшла французская песенька "Лалы, квітней ружа"? Таксама з ягонай: чаму ж не перакласьці, калі падабаецца…***

***"Атрымліваецца, што я, асабліва ў маладыя гады, усяго пакаштаваў. І танцы былі бальныя, і сьпеўкі, і лялечны тэатр (пасьля ў Пазьняка прачытаў, што тэатр – гэта аснова, нацыя адраджаецца з тэатра), і выдавецкая справа***

***(бібліятэчка "Студэнцкай думкі", часопіс "Унія")… Столькі ж было ўсяго, чым я займаўся, — дзівіцца сам Гэнік. – Як гэта Вітушка кажа: трэба ўсяго пакаштаваць, але ня ўсё рабіць".***

***Прафесія скульптара – ці не занадта сур'ёзная й цяжкая "індустрыя" для такога вясёлага хлопца? Дык вось жа слухаецца яго і гліна, і дрэва, і гіпс, і метал, і камень… Але ўлюбёным Гэнікавым матэрыялам аказаўся… пясок (у зімовым варыянце – сьнег). Апошнія восем гадоў Гэнік Лойка кіруе скульптурным пленэрам "Легенда з пяску".***

*Галіна:* Скажы, Гэнік, ці ёсьць у цябе сярод менскіх скульптураў – паркавых, вулічных – якаясь улюбёная? У мяне вось доўгі час былі Купалкі ў фантане ў Купалаўскім парку.

*Гэнік:* А, ты пра скульптуру… Пра скульптуру нічога ня ведаю. Не магу сказаць, каб нешта захапляла вельмі моцна, кранала з менскіх скульптураў.

Хіба пра дзяцінства скажу. У дзяцінстве падабалася мне тая скульптура, якая была найбліжэй да нашай вёскі (Мікелеўшчыны, што на Мастоўшчыне) – у Правых Мастах, здаецца: пралетарый нясе дзяўчынку і сьцяг, а дзяўчынка яшчэ й голуба пускае. І складкі на портках у пралетарыя былі, як… сапраўдныя. Вось гэта мяне захапляла.

*Галіна:* Можа, тады й пацягнула цябе што-небудзь такое рабіць?

*Гэнік:* Можа быць, я нават пералепліваў нешта, ну там, з пластыліну ляпіў нават нейкія партрэты – то матроса, то танкіста, то яшчэ каго…

*Галіна:* А як ты думаеш, — вось Менску нашаму пад тысячу гадоў ужо, — чаму менчукі дагэтуль не паставілі помніка Менеску, легендарнаму заснавальніку гораду?

*Гэнік:* Дык праекты ёсьць. І студэнты рыхтуюць, я бачыў студэнцкія праекты. Думаюць пра гэта. Але чаму не паставілі?... А таму, што мы Стары Горад разбураем да гэтай пары, вынішчаем усё…

*Галіна:* Усё, што Менескам зроблена?

*Гэнік:* Усё, што зьвязана з легендамі. Калі б менчукам патрэбны быў Менеск, дык яны ахоўвалі б вось гэты Менск, паўсталі б на абарону Менску. Тады й Менеска паставілі б.

*Галіна:* От, каб твой Менеск ды застаўся там ляжаць, дзе ўзімку прылёг быў! Такі сабе бог антычны раскошны… Дык не – ня з нашым шчасьцем. Са сьнегу зрабілі – з вадой сплыло.

*Гэнік:* Можа, так яно і цікавей. Гэта толькі напамін – толькі напамін людзям пра таго Менеска. Мы ж лепім гэтыя вобразы з пяску – а цяпер вось са сьнегу і лёду – дзеля таго, каб абудзіць людзей, каб зьвярнуць увагу на нашыя легенды.

*Галіна:* А вось уявіць на якіх-небудзь тут пагорках, над Сьвіслаччу ці дзе, катoрага з тваіх волатаў, калі зрабіць яго з трывалага матэрыялу, — гэта ж надало б аблічча краявіду, менавіта беларускае аблічча. Асабліва Менеска шкада, што растаў. Мне здаецца, нічога падобнага ў Менску й блізка не было. І тыя ўсе постаці, што ня ў Менску рабіліся, няхай бы там, у тых гарадах, мясьцінах, заставаліся.

*Гэнік:* Можа быць, але мяне гэта не цікавіць. Мы робім менавіта з пяску дзеля таго, каб скульптуры рассыпаліся – каб выклікаць у людзей жаль. Не за скульптуры, а за легенды нашыя, — што мы растоптваем іх сваімі нагамі… Каб неяк павярнуць сьвядомасьць людзей.

*Галіна:* І колькі іх ты ўжо "адкапаў"?

*Гэнік:* Усяго восем пленэраў прайшло. Першы – "Рагнеда", у Заслаўі. Другі пленэр – у Магілёве. "Магіла Льва" — Машэка і ягоная дзяўчына (Прадслава, ці то Наталька – паводле Купалы, — ці то "Аксана з Лаўсана", як мы жартам яе клікалі) — і з імі Леў крылаты, што ахоўваў іхні сон. Далей – у Наваградку, "Міндоўг": дзьве скульптуры. Пасьля "Гражына" ў Наваградку. Потым Крэва – "Скуты Кейстут". Пасьля ў Гомлі "Цмок". Наступныя – "Дванаццаць Залатых апосталаў",

зноў у Заслаўі. Усіх дванаццаць зрабілі, хоць людзей няшмат прыехала… І вось цяпер Менеск – восьмы – ужо з лёду, са сьнегу і лёду.

***Галіна:*** Гэта ж тады, як Менеска рабілі, быў Міжнародны Дзень роднай мовы і 15 градусаў марозу?

***Гэнік:*** Ага. Так што ўсё на ходу замярзала, вадой палівалі, дык умомант схоплівалася. Халодна было, але рабілі, бо Дзень роднай мовы – гэта сьвятое.

***Галіна:*** Усё адно нядоўга паляжаў Менеск пры млыне сваім. Нетрывалае племя асілкаў, як і ў міфалогіі... Рагнеда – найвялікшая – пад сорак метраў была?

***Гэнік:*** Не, гэта так называецца 40 метраў, калі і косы яшчэ ўлічваць, якія мы не дамервалі...

***Галіна:*** Астатнія постаці не такія вялізныя, але ўсё ж валатоўскіх памераў?

***Гэнік:*** Так… Хаця, калі б Кейстута ўсяго з-пад зямлі дастаць, таксама быў бы недзе такой даўжыні. Проста мы “дасталі” толькі ягоныя рукі і ногі...

***Галіна:*** Столькі волатаў, дасканалых формаў, аб’явіліся – і зноў сышлі хто ў пясок, хто ў ваду…

***Гэнік:*** Яны не такія ўжо й дасканалыя, і таму мне ня вельмі й хочацца выкладаць іх вось так – з вечнага матэрыялу. Гэта хутчэй проста цень, напамін пра іх – і ўсё. Гэта пясок… Таму і трэба, каб яно рассыпалася… каб…

***Галіна:*** …разбурылася… І каб пашкадавалі.

***Гэнік:*** І каб людзі пашкадавалі – найперш ня гэтыя скульптуры, а падумалі пра гістарычную памяць, культуру, легенды, якія зьнікаюць. Калі от людзі кажуць: “Ах, как жалко, — что ты без цемента…” і ўсё такое, я кажу: “Пясочку шкадуеце? Не пра гэта шкадуйце. Ня плачце пра гэтыя скульптуры, гляньце пад ногі. Што топчаце? Плачце, што мову сваю беларускую зьнішчаеце”.

***Галіна:*** Твае скульптуры амаль што мовай прамаўляюць? Сапраўды гэтыя пленэры – накшталт паэтычных імпрэзаў: творы жывуць, пакуль яны гучаць для прысутных. А хто хацеў пачуць і не дайшоў – выбачайце…

***Гэнік:*** Гэта жанр у скульптуры такі – ён вядомы па ўсім сьвеце. Усюды робяць скульптуры з пяску, знарок дзеля таго, каб людзі маглі прыехаць у пэўны час, усе разам сабрацца, паглядзець, бо іначай – больш ня ўбачыш. “Маментальнае мастацтва”. У гэтым нешта ёсьць. Таму й ладзяцца такія пленэры ў розных краінах. Наш пленэр, мусіць, унікальны. Па-першае, на Беларусі такіх больш няма. У нас нават ладзіцца ня так мастацкі пленэр, а менавіта – “Легенда з пяску”.

***Галіна:*** Больш літаратурны?

***Гэнік:*** Больш ідэалагічны, скажам так, нацыянальна-патрыятычны. Нашая мэта – засьведчыць, што нацыя памятае пра свае скарбы.

Па-другое, гэта ня конкурс, ён ня дзеля таго, каб зрабіць прыгожую скульптуру, я ня ведаю, прыгожыя яны ці не прыгожыя, мне асабіста яны ня вельмі падабаюцца…



*Менеск у Менску.*



*Так нараджаюцца скульптуры.*

***Галіна:*** Прыгожыя, прыгожыя.

***Гэнік:*** Усе кажуць, што прыгожыя, прыгожыя, і ўсе цешацца. Ну, няхай. Асабіста я не зьвяртаю ўвагі на эстэтычны бок гэтага пленэру. Ён ідэалагічны. Мы нават выбралі сабе такі дэвіз, перайначыўшы вядомае "…scripta manent": "Arena volat, mythus manet" – "Пясок зьлятае, легенда застаецца". Так што ўся ідэя нашых пленэраў – паказаць наяве, як зьнікае штосьці большае за гэтыя творы: дух і душа гэтай зямлі. Тое, чым яна адметная, унікальная, адзіная ў сьвеце. Вось гэта – беражыце. Гэта ў вашых сілах. Ня цэменту трэба дадаваць да пяску, каб ураtaваць гэтыя скульптуры, а на вашым жа языку ёсьць беларуская мова, яе й захоўвайце. Не чігірікайце па-расейску. Усё ў вашых сілах. Вось так мы гледачам кажам.

***Галіна:*** А арганізаваць прастору, зьмясьціць у краявідзе такія гожыя трывалыя арыенціры, каб воку было за што зачапіцца?...

***Гэнік:*** Гэта так проста, элементарна, гэта ўсё скульптары ўмеюць рабіць. І ёсьць цэлыя інстытуты, якія рыхтуюць такіх скульптараў і архітэктараў.

***Ірына Дубянецкая** (далучаецца да гаворкі)*: І што мы маем? Вось Менск: з мастацкага гледзішча надзвычай нудны горад, шэры і ўбогі. Апроч літаральна пары прыемных скульптурак Жбанава, нічога ж няма…

***Гэнік:*** І хочацца да іх дакрануцца, і менавіта дзеля таго яны й зробленыя, каб датыкаліся…

***Ірына:*** А ці ня Жбанаў прапаноўваў: аддайце, маўляў, горад на дзень (ці, ня памятаю, на ноч, — ну няхай на тыдзень) мастакам – і мы зробім казку, горад-карціну. Як ты думаеш? Каб увесь Менск расьпісалі, размалявалі ды скульптурай напхалі? Як калісьці Шагал пачынаў з Віцебскам. Каб кожны будынак стаўся карцінаю?...

***Гэнік:*** Гэта, мусіць, не мастакам трэба аддаваць. Трэба аддаваць тым людзям, якія хочуць гэта зрабіць. А мастакі ня хочуць. Вось рабілі скульптары Ленінаў, а цяпер на лысіну берэт – Скарына атрымаўся…

***Ірына:*** Ці апостал Павел, нават без берэта, адно вусы падправіць.

***Гэнік:*** Мы вельмі лёгка паддаемся гэткаму ветру. Любому. Трэба так – так зробім, будзе іншая кан'юнктура – гэтак. А каляровы Менск зрабіць – гэта толькі графіцістам прапаноўваць. От толькі яны такім займаюцца. І ўсё. Напэўна, не падымуцца мастакі, так як і мы, нацыяналісты, не падымаемся на тое, каб абараніць мову.

Але вы толькі заплаціце нам грошы – пэўнаму мастаку за пэўную сьцяну, ён адграбае замову сабе дзяржаўную і замалёўвае той кавалак, які яму далі. І скульптар будзе рабіць, калі яму заплоцяць грошы, — тады будзе вясёлы горад. Толькі плаціце. Будзе воля аддаваць грошы не на АМОН, а на скульптуры, то аддадуць. Пакуль жа ў нас уся зарплата ідзе АМОНу, а ня скульптарам.

Гэтую цяжкую індустрыю – бо скульптура, як кажуць, цяжкая індустрыя ў мастацтве, — нельга падняць на адным энтузіязме.

***Галіна:*** Але ты ж гэта робіш…

***Гэнік:*** З пяску, на энтузіязме – студэнты робяць, ці школьнікі, гэта вельмі цікава ім, і патрэніравацца ляпіць, і пабачыць сваім вокам – што нават фотааб'ектыў не ахоплівае – гэтую скульптуру велізарную, і сваімі рукамі такую зрабіць. Гэта вельмі цікава, таму студэнты прыязджаюць, у нас поўны пленэр заўсёды, і заўсёды з гатоўнасьцю, на адным энтузіязме, працуюць проста да позьняй ночы.

***Ірына:*** А вось, да прыкладу, калі скульптурнай школе даць, бяз грошай, матэрыялу – рабіце, і выстаўляйце свае скульптуры, і ўпісвайце ў ландшафт, як хочаце.

***Гэнік:*** Няма ў нас такіх... Аднак вось зьяўляецца цэлая плынь у нашай Акадэміі мастацтваў. Гэта Ігар Засімовіч, Андрэй Вераб'ёў — яны арганізавалі скульптараў, Копач Віктар, усіх я не згадаю, там вельмі шмат студэнтаў. Узялі грант сабе, на гэты грант накупілі машынак, камянёў – і парэзалі, і зрэзалі ўсё – цэлы дзіцячы садок так от заставілі. І цяпер можна зьезьдзіць, паўзірацца. Вельмі цікавы пленэр. Вось гэта тое, што мяне захапляе са скульптуры ў Менску. Хлопцы й каталог выдалі "Раз-

мова з камянямі”. Я ў захапленьні ад іх суполкі. У наш час не было такіх студэнтаў. Былі й да гэтага пленэры – у часы перабудовы, у парку Янкі Купалы (і цяпер там некалькі каменных скульптураў засталося з таго пленэру).

***Галіна:*** Гэта як – даецца камень кожнаму?...

***Гэнік:*** Дамаўляюцца з мастакамі, адбіраюць скульптараў, хто са сваімі ідэямі, і горад выдае камяні, нейкі ганарар, мусіць, і яны працуюць.

***Галіна:*** І думаюць, што для вечнасьці. А які быў лёс вашых скульптураў?

***Гэнік:*** Скульптуры развальваліся па-рознаму. Рагнеда доўга праіснавала – ну, было, развалілі ёй адразу нос, рот, у губу ўставілі бутэлечку ад піва, яшчэ дзеткі нейкую дзірачку недзе выкапалі, і ўсё, — і рассыпалася яна яшчэ доўга-доўга пад вятрамі і сонцам аж да восені: асноўныя аб’ёмы былі яшчэ ў верасьні відаць.

А ў Магілёве, калі мы зрабілі тры постаці, пачалося гарадское Купальле – суцэльная п’янь, — і савок літаральна за паўгадзіны ўсё зьнішчыў.

***Галіна:*** Ты што?!

***Гэнік:*** Так. Растапталі ўмомант. Там лёгка было таптаць, бо тэхналогіі нашай цяперашняй мы яшчэ ня ведалі, так што моцна пясок не трымаўся. І растапталі вельмі лёгка, хутка.

А ў Наваградку рабілі Міндоўга і ён у нас разваліўся… І тады мы наранку зьляпілі партрэт Міндоўга – адну вялізную галаву. Конанаў прыехаў з Магілёву, і кажа: ну дык гэта ж іншы горад!.. А Гражына доўга «жыла». Там пясок чысьцейшы. І яна добра зьленая была.

Цмок доўга ляжаў у Гомлі. Дзіўна. Думалі, ну ўсё, разваляць людзі. Праз тры дні туды паехаў мой швагер і звоніць мне. Я пытаю: “Ну што там Цмок, цэлы?” – “Пакуль што цэлы. Дзеці зьязджаюць з яго, але стараюцца, калі што адваліцца, прылепліваюць пасьля”. – “А вочы цэлыя?” – “Адно вока цэлае, другога няма”. Аказваецца, абодва вокі былі, але ён ня ўгледзеў, там жа люстэркі стаялі, павернутыя, і яму не відно было. Так што доўга, можа, тыдзень ці колькі трымаўся Цмок.

***Галіна:*** А ў Крэве?

***Гэнік:*** І Кейстут доўга ляжаў. Крэва – пустое, людзей няма, мы зрабілі ні для кога, для саміх сябе. Ніхто яго, па сутнасьці, й не пабачыў. Мы абяцалі: назаўтра ж усё разьбяром і паедзем. Але так і пакінулі. І не прыехалі, і нічога не разабралі. І ляжаў ён доўга-доўга.

Яшчэ мы эскізы звычайна робім з гліны, і гэтыя эскізы дорым: запаведніку “Заслаўе” падарылі, у Наваградку музею пакінулі, у Магілёве знаёмым пакінулі, у Гомелі Цмока глінянага пакінулі Яўгену Малікаву. Так што эскізы застаюцца.

***Галіна:*** А каторыя з тваіх твораў для цябе важнейшыя: тыя, што можна й зараз паглядзець – каменныя, драўляныя, металёвыя, ці – пясчаныя, якіх ужо няма?

***Гэнік:*** Цяпер такі час, што я ўвесь аддаюся пяску. Проста ў мяне душа, відаць,



*Адзін з Апосталаў у Заслаўі.*



*Гомельскі Цмок.*

у ранейшых жыцьцях, у ранейшых інкарнацыях жыла ў пустэльні пясчанай, таму мне так блізка гэта ўсё, і пясок, і сама ідэя…

***Галіна:*** “Замкі на пяску – дружа, гэта так па-беларуску”, як сказаў табе Алесь Пушкін.

***Гэнік:*** Гэта і не скульптуры ўвогуле, гэта ўсё – міраж, фата-маргана, прывід. (Сьмяецца). Так што й гаварыць пра гэта няма чаго. Насамрэч, самае важнае – гэта ствараць легенды, берагчы легенды ў самым цьвёрдым, моцным месцы – у сэрцы.

***Галіна:*** Сапраўды, “arena volat”, — пясок ляціць праз вечнасьць, зьнікаюць і цывілізацыі са сваімі міфамі, а пясок, вечнае гэтае рэчыва, застаецца: рабі з яго зноў… “Arena manet”. І тыя “вечныя” скульптуры з погляду вечнасьці не нашмат “даўжэйшыя” за пясчаныя. І манументальнае мастацтва за “маментальнае”.

***Гэнік:*** Манументальнае мастацтва... Вашчанка зрабіў мазаіку на гатэлі “Турыст”, і цяперака яна рассыпаецца. Як толькі хочам нешта зрабіць “навекі”, так яно й развальваецца…

***Галіна:*** Тады хочаш зрабіць на імгненьне – а яно ў памяці застаецца…

***Гэнік:*** Самае важнае, каб засталося ў памяці. І каб вярэдзіла. Людзям паказваем фоткі, а яны локці кусаюць. “Чаму ж я не прыехаў?” А калі клічам на пленэр, ня надта й едуць.

***Галіна:*** Бо загрузла кола ў пясок, так, як на тваёй эмблеме?

***Гэнік:*** Гэта – пра пленэр “Шлях з варагаў у грэкі”. Ён завяз – і надоўга, мусіць. Вось цяпер Акудовіча прачытаў…

***Галіна:*** І што?

***Гэнік:*** Адсутнасьць. Як там? — код адсутнасьці. У Акудовіча на наш рух песімістычныя погляды. У мяне таксама. Ня ведаю, калі ў нас “Шлях з варагаў у грэкі” будзе. Адкладваецца надоўга. Наогул, ці будзе…

***Галіна:*** Дык, можа, Акудовіч проста правакуе?

***Гэнік:*** Не, гэта праўда. Вось ён кажа, што жыцьцё ў нас адбудоўваецца, паглядзець – вуліцы чыстыя, прыгожа… Але гэта жыцьцё бяз нас. Мы, нацыяналісты, прайгралі, мы – аўтсайдары, стаім з боку і назіраем, як жыцьцё ідзе, як працуе ўсё, як краіна жыве. А мы ў гэтым ня ўдзельнічаем. Гэта ня мы робім. І я, класічны нацыяналіст, якім я ёсьць і застануся, от так буду стаяць збоку і чакаць цуду, калі ўсё павернецца ў мой бок... А кола загрузла.

***Галіна:*** Дык распавядзі пра “Шлях...”.

***Гэнік:*** Гэта вельмі прыгожы пленэр, вельмі прывабны. Уявіце: дзесяць краінаў, па трое-чацьвёра маладых людзей з гэтых краінаў прыедуць, нашых будзе недзе столькі ж – 30-40 чалавек, і цэлы тыдзень будзем жыць разам, за гэты час пасьпеем нават пасябраваць.

***Галіна:*** Менавіта канкрэтныя дзесяць краінаў?

***Гэнік:*** Так, дзесяць краінаў, якія знаходзяцца ад Беларусі на поўнач і поўдзень. А з захаду і ўсходу ні Польшчы, ні Расеі ня будзе...

***Галіна:*** Краіны з мерыдыяну?

***Гэнік:*** Так. Хаця, на самой справе, запросім Данію, а яна знаходзіцца на той самай паралелі, што й Полацак, толькі на Захадзе. Данія, Швецыя, Нарвегія, Фінляндыя, Эстонія, Латвія, Літва, Беларусь, Украіна, Малдова і Грэцыя. Ня Турцыя, дзе Стамбул, куды Шлях і ляжаў, у Візантыю, а Грэцыя. Чамусьці хочацца чыстых грэкаў.

Можа, гэта й не зусім адпавядае мерыдыяну, але сутнасьць такая: павярнуць вектар сьвядомасьці на 90 градусаў – упоперак: ня ўсход-захад, а поўнач-поўдзень. Мы ўвесь час шукаем сваё месца на зямлі паміж палякамі ды расейцамі: хто мы – спольшчаныя расейцы ці абруселыя палякі? А поўнач-поўдзень, гэты накірунак забыты. І вось нам хочацца правесьці гэты Шлях, каб знайсьці на зямной кулі нашыя

каардынаты, дакладней, нашую страчаную каардынату. А гэта ж ёсьць нашая галоўная, касьмічная (сакральная) каардыната – па мерыдыяне, адносна палюсоў (няма палюсоў заходняга ды ўсходняга). Вельмі папулярны гэты вектар захад-ўсход, а вектар нашага пленэру будзе перпендыкулярны да гэтага.

"Шлях з варагаў у грэкі" – гэта будзе краіна. Краіна на тыдзень часу і на адзін кар'ер прасторы. Я меркаваў, рабіць так у Заслаўі, там добрыя кар'еры, але, мусіць, пакуль сасьпее задума, яны ўжо зарастуць, а таму будзем шукаць нешта новае, можа, пад Полацкам ці яшчэ дзе. У гэтай краіне будзе свой урад – тыя ж удзельнікі будуць і міністрамі розных справаў. Кожны раз, калі, дапусьцім, час працы наступае, самы галоўны – міністр працы, і ён указвае, колькі каму шуфляў браць, дзе што капаць, што дзе рабіць, — разьмяркоўвае. Усе астатнія міністры становяцца шараговымі грамадзянамі. Пасьля настае час адпачынку – і міністр гаспадаркі ўказвае, дзе каму чаго пад'есьці, дзе паспаць. Кожная краіна прывязе са сваёй радзімы лекцыю, можа быць, навуковую, песьню, танец і яшчэ што-небудзь – і штовечар ля вогнішча будзем ладзіць навуковую канферэнцыю ці канцэрт. На гэты час найгалоўным будзе міністр культуры.

***Галіна:*** І кожная краіна прывязе сваю легенду?

***Гэнік:*** Так. Нейкі эскізік свае скульптуры – сюжэт любы, хоць сабе літаратурны твор – і робіць скульптуру. Паколькі скульптуры вялізныя, трэба шмат народу, то кожнай краіне будуць дапамагаць беларусы. Калі, можа, ад якой краіны прыедзе толькі адзін чалавек ды й то ня скульптар, нашыя творцы дапоўняць тую брыгаду і дапамогуць зрабіць. Так што гэта будзе ня конкурс, хто лепш зробіць, а проста гэткі фэст. Усім краінам беларусы будуць дапамагаць, таму мы і мяркуем так: 30-40 гасьцей і 30-40 беларусаў.

***Галіна:*** А памятаюць там, у тых краінах, пра гістарычны Шлях з варагаў у грэкі? Хто хадзіў тым шляхам?

***Гэнік:*** Швецыя ладзіць такія паходы. Па рэках ходзяць, чаўны робяць, як іх, дракары, — ёсьць такія эксьпедыцыі. Калі мы рабілі «Магілу Льва» ў Магілёве, якраз сустрэліся з удзельнікамі такой вандроўкі...

Таму нам і хочацца на нашай зямлі зрабіць такую дзяржаву. У ёй будуць гучаць мовы ўсіх дзесяці краінаў і ангельская. Добра было б сабраць такую каманду, каб самі ўдзельнікі пленэру загадзя заняліся пошукам за мяжой нашых аднадумцаў, кожны адказны за сваю краіну – адшукае людзей, вывучыць гэтую краіну і яе мову й будзе апекавацца тымі людзьмі, што прыедуць.

***Галіна:*** А ці спрабавалі гукнуць аднадумцаў праз Інтэрнэт?

***Гэнік:*** Ідэя, можа, ужо і трапіла ў Інтэрнэт, але яшчэ рана заклік пасылаць, бо ў нас беларусаў няма: тых, хто гэта пацягне. Пытаюся ў студэнтаў: "Ну што, ці гатовыя вы ступіць на Шлях з варагаў у грэкі?" А яны: "А когда едем?". Я кажу: "Не. Ці гатовыя вы пакінуць сваю расейскую мову і гаварыць па-беларуску?". І тады вочы долу, нічога не адказваюць. Так што, яшчэ беларусаў няма... І няма як рассылаць запрашэньне замежнікам. Бо тамака, спадзяюся, лёгка будзе падняць любую кампанію.

***Галіна:*** А тыя, што робяць «Легенду з пяску», з іх няможна выбраць?

***Гэнік:*** З іх, пэўна, некалькі чалавек. Астатнія таксама размаўляюць па-расейску. Са мною па-беларуску, а між сабою па-расейску. І колькі я ні б'юся, да іх не даходзіць. Ім так нармальна, утульна, пярун з яснага неба не забівае нікога, так і жывуць.

***Галіна:*** Няма ўжо ні «Майстроўні», ні «Талакі», — такога вось гнязда, кублішча гэткага…

***Гэнік:*** Цяпер вельмі шмат суполак, тусовак, але падобных, такога ўзроўню, больш няма. Мусіць, гэта былі адзіныя на ўсю нацыю... І такога праекту, як наш, пра які я распавядаю, таксама няма: я маю на ўвазе зусім-не-расейскі пленэр. Каб

у акіяне расейшчыны хоць прапалоць невялікую дзялянку і даць расьці гэтаму кволаму беларускаму.

Нашая краіна будзе мець свае сілавыя структуры – памежныя войскі і ўнутраную паліцыю. Памежнікі будуць хадзіць з сабакамі, з біноклямі па межах нашага кар'еру і чужых людзей будуць прапускаць ня інакш, як праз мытню. А ў мытні будзе свая валюта, будзе шапік "абмену", дзе іншаземная валюта будзе мяняцца на талеры. І толькі за талеры можна будзе трапіць на гэтую тэрыторыю – калі хто проста захоча там пажыць, патусавацца ў нашым асяродку. Унутраная паліцыя будзе сачыць за тым, каб ніхто не размаўляў на расейскай мове, парушальнікаў адлоўліваць і штрафаваць. Будзе даваць квітанцыю вельмі прыгожую, каліграфічным почыркам выпісаную, дзе сказана, што, маўляў, вас аштрафавалі за тое, што вы... зьнішчаеце беларускую мову, — што-небудзь такое прыгожае на памяць... "Ніколі ў Беларусі за падобнае не штрафавалі, хутчэй наадварот, а вас аштрафавалі", гэта будуць унікальныя квітанцыі.

Далей, калі пачнецца сам фэст, і мы будзем паказваць гатовыя скульптуры, зьедзецца вельмі шмат народу, тысячы людзей прыедуць паглядзець, — тады ўжо ня толькі памежныя войскі, але ўсе ўдзельнікі-беларусы стануць унутранай паліцыяй. Гуртамі па некалькі чалавек будуць сноўдаць паміж тысячамі наведнікаў, прыслухоўвацца, улазіць у размовы і штрафаваць парушальнікаў.

***Галіна:*** Выдаваць граматы.

***Гэнік:*** Ня тое што выдаваць, а прадаваць. Аштрафаваны мусіць талерамі аплаціць гэтую квітанцыю.

***Галіна:*** А талеры з чаго будуць – з гліны?

***Гэнік:*** Можна й гліняныя зрабіць, можна й металёвыя, але, напэўна, папяровыя зробім. У нас ёсьць свой герб, свой сьцяг — бела-жоўта-белы. І мова дзяржаўная ў нас беларуская. І ў мяне такое жаданьне, каб графікаю гэтай мовы была лацінка. Мне хацелася б нават, каб у "Дзеяслове" гэтая гутарка друкавалася беларускай лацінкай... Яе вельмі цяжка, вельмі складана чытаць, яна непатрэбная. Але нам і пясчаныя скульптуры непатрэбныя, яны рассыпаюцца. Нам наогул беларуская мова непатрэбная… Мне б хацелася такім чынам – лацінкай – абмежаваць кола чытачоў толькі тымі, хто гатовы чытаць па-беларуску нават лацінскімі літарамі.

***Галіна:*** Ты сам, я ведаю, заўсёды лацінкай пішаш, нават маленькія прыватныя цыдулачкі. Думаеш, лацінская графіка больш пасуе беларускай мове?

***Гэнік:*** Нашая лацінка мае шмат добрых якасьцяў, але гэта ня так істотна, можна й арабскімі літарамі, як у аль-кітабах, пісаць. Але такім чынам — адмежавацца ад расейскай мовы. Бо цяпер расейская падмяняе беларускую мову ўсюды, выцясьняе – значыць, расейская мова нясе пагрозу для беларускай мовы, пры ўсім тым, што я бачу, якая яна прыгожая, якая яна багатая, якая найвыдатнейшая мова, тым ня менш яна зьнішчае маю родную мову, — а любіць забойцу свайго бацькі толькі за тое, што ён дужэйшы, мацнейшы, і нібыта прыгажэйшы за майго бацьку, — я ня бачу ў гэтым сэнсу. Калі прыйдзе ангельская мова і запануе на Беларусі, тады ўжо нацыяналісты будуць…

***Галіна:*** …забараняць ангельскую мову?

***Гэнік:*** Ня столькі забараняць – яе не забароніш, — але ўхіляцца ад яе. Адмяжоўвацца. І па-мойму, усе нацыі, усе краіны праз такі нацыяналізм праходзяць. А мы чамусьці баімся. Каго ні запытаеш: "Па-расейску ўмееш гаварыць? – Умею. – Гаворыш? – Гавару. Таму што я паліглот, я культурны чалавек, я валодаю гэтай мовай, а хтосьці не валодае, і я адказваю ім па-расейску, і такім чынам паказваю свой высокі культурны ўзровень і тое, што я за іх лепшы". А я лічу, што калі гаворыш па-расейску, у нашай сітуацыі – гэта не паказчык культуры. Гэта паказчык бескультур'я. Бо, калі сказаў па-расейску, ты ў гэтую хвіліну ў гэтай кропцы прасторы зьнішчыў беларускую мову. А гэта з культурай ніяк не зьвязваецца. І ты

ня можаш называцца беларускім інтэлігентам, калі зьнішчаеш родную мову. І ты ня можаш гаварыць, што ты любіш Беларусь. А такіх процьма. Заходзіш на сядзібу Беларускага Народнага Фронту – гэтае нібыта логавішча нацыяналізму – маладыя людзі стаяць і спакойна гавораць па-расейску. Я за тое, каб шчыра ў вочы казаць: калі ты не гаворыш па-беларуску, то ты не беларус. І не называй сябе беларусам.

***Галіна:*** Дык «Шлях з варагаў у грэкі» ня можа адбыцца, таму што ня можа набрацца каманда беларусаў?

***Гэнік:*** Так. Няма такіх людзей, якія б не хацелі расейскай мовы.

***Галіна:*** Няўжо? Мне здаецца, столькі ёсьць цалкам беларускамоўнага люду...

***Гэнік:*** Ёсьць. Але, можа быць, яны занятыя нечым іншым – важным. А сюды трэба сабрацца маладым людзям, якім няма больш чаго рабіць, а толькі ў пясочку какапацца.

***Галіна:*** 30-40 чалавек?

***Гэнік:*** Усяго. Добра было б 100 чалавек мець і з іх выбраць толькі 30. Так, як выбіраў нейкі там палкаводзец сабе ваяроў: прывёў да вадапою сваё войска вялікае і назіраў, як людзі нахіліліся піць, — і выбраў толькі тых, хто ня выпусьціў з рук зброю. Я за тое, што нам патрэбнае не шырокае аморфнае войска, а вастрыё стралы: адабраць як мага менш людзей і з імі зрабіць тое, што трэба. І цэлая нацыя пойдзе за імі. За гэтымі 300-мі спартанцамі.

І не абавязкова ўсёй нацыі быць такімі патрыётамі. Нацыя будзе жыць, як і належыць. Нацыянальныя інтарэсы будуць нормай. Так, як і ў Расеі. Паспрабуй зачапі расейскую мову…

***Галіна:*** “Вастрыём” перакуліць сітуацыю?

***Гэнік:*** Так. А не скульптурай.

***Галіна:*** Ну, чаму ж не? Калі б, скажам, твой Менеск стаяў пасярод гораду, толькі ня сьнежны, а трывалы, і вабіў вока, і чапляў сьвядомасьць, і будзіў цікаўнасьць да легенды, а ў каго – і жаданьне гаварыць на мове…

***Гэнік:*** *(усхвалявана)* Дык вось, калі ласка, настаўлена помнікаў, і дзе тая сьвядомасьць? Чаму менавіта скульптура будзе ўплываць на мову? А можа, паглядзеўшы на нашыя скульптуры, чалавек палюбіць оперныя сьпевы?...

У “Нашай ніве” таксама так кажуць: “От Вольскі робіць справу: канцэрт ладзіць... І гэтым ён болей дае для Беларусі, чым які-небудзь цьвердалобы ідэолаг”. Я ня згодны з гэтым. Я таксама раблю свае праекты, даказваю вам, што не скульптура прывядзе да беларускай мовы. І не канцэрты Вольскага. Чалавек паслухаў і пайшоў чігірікаць па-расейску. Прачытаў Караткевіча, загарнуў кніжку, і “понял, что Караткевича надо читать в оригинале”.

***Галіна:*** Але “працэс” то “пайшоў”?

***Гэнік:*** Гэтак, як “пайшоў працэс” пасьля таго канцэрту, ці як пасьля Рагнеды, што мы зрабілі з пяску… Чалавек ідзе далей і чігірікае. А што трэба рабіць, каб дайшло? Казаць толькі ў лоб! Так во: гавары са мной па-беларуску! *(Паказвае на сваю значку, дзе так і напісана).*

***Галіна:*** А ты калі пачаў размаўляць па-беларуску?

***Гэнік:*** Як толькі ўцяміў тое, недзе ў 1980-м годзе, адразу пачаў па-беларуску. Ну, год яшчэ вучыўся, цяжка было перакладаць марксізм-ленінізм усялякі. Сьмяяліся з мяне, як я стаю-пакутую, доўга думаю, не магу слова перакласьці, урэшце скажу па-расейску, тады — га-га-га!, — усе зарагаталі.

***Галіна:*** І ты нават ня хочаш пачакаць, каб іншым гэта дайшло да нутра?..

***Гэнік:*** У сэнсе – паступова, паступова? Не, гэта прыходзіць адразу, імгненна. Усё! Я размаўляю па-беларуску! З гэтага моманту і назаўсёды. Ужываю яшчэ расейскія словы, пакуль вучуся гаварыць, але – я ўжо ведаю сваю ўстаноўку. Я адразу сасьпеў, а далей дасьпявае мая мова – гэта ўжо тэхнічны момант. Паступова толькі

вынішчаецца мова беларуская. Паглядзіце, як цяпер вынішчаецца: паўзучым спосабам.

***Галіна:*** За Саветамі было радыё, тэлевізія па-беларуску. Праўда, на такой мове, да якой ня надта гарнула, але ўсё ж такі хоць якое беларускае "вяшчаньне" было чалавеку. А цяпер…

***Гэнік:*** Страшна. Вось будзе новы перапіс насельніцтва, і вельмі шмат народу адмовіцца ад беларускай мовы. Раней вельмі шмат людзей прызнавалі роднай мовай беларускую, цяпер можа здарыцца адваротнае. І найбольш псеўдадэмакратыя шкодзіць. Пры якой ты нібыта можаш гаварыць на любой мове. І пакуль мы не ўсьвядомім, што фраза: "Я имею право говорить на том языке, на каком хочу" перакладаецца на людскую мову як: "Ты маеш права зьнішчаць маю родную мову (і ты яе зьнішчаеш)", датуль сітуацыя не павернецца.

***Галіна:*** Гэнік, а што цябе ў жыцьці радуе?

***Гэнік:*** Радуе – усё! Кожная праява жыцьця. Аж вочы разьбягаюцца.

***Галіна:*** Ты ўцелясьняеш мары ў сваіх творах. А ёсьць у цябе мара над марамі?

***Гэнік:*** Ёсьць "блакітная" мара: адкапаць у егіпецкім пяску Сінюю-сінюю – беларускую легенду, якая там ляжыць.

Ёсьць "ружовая" мара: выкапаць у Вільні пясчанага Жалезнага Ваўка з Гедымінавага сну.

А мара над марамі – гэта, каб Беларусь была беларускаю. Як ні дзіўна, як гэта ні банальна гучыць. Саромеўся быў прызнавацца ў тым – ну некалі, у маладосьці, як пад уплывамі рознымі знаходзіўся. А цяпер, азірнуся назад – што мяне найбольш хвалюе? Толькі вось гэта. І ўсё.

***Галіна:*** А Беларускую Беларусь як ты ўяўляеш?

***Гэнік:*** На беларускай мове. Адна мастачка пытае: і што, тады адразу будзе шчасьце? Так, ну вядома ж!

***Галіна:*** Беларускамоўныя зладзюгі, камунякі, прасталыткі?

***Гэнік:*** Дык гэта ж самае галоўнае. *(Сьмяецца)*. Уяві, калі адабраць у гэтай мастачкі расейскую мову. Ёй так захочацца "вялікага і магучага", які адзіны ёй "паддзержка і апора", што будзе здавацца: вось вернецца расейская мова – і настане рай. Будуць усялякія праблемы на працы, у сям'і, усялякія трэньні з людзьмі, болі ўсялякія, радасьці, але – мова будзе. І будзе паўнацэннае жыцьцё. Так і ў нас: будзе мова – будзем іншых вышыняў дасягаць, нечага дабівацца і займацца нармальным жыцьцём. А так – гэта ненармальна.

У Наваградку, калі мы рабілі Міндоўга, была такая ідэя вяроўкаю абгарадзіцца, маўляў, тут нашая краіна, і ўсё; хто ўваходзіць на нашую тэрыторыю, калі ласка, гаварыце па-беларуску. Прыязджае ОНТ, хоча зьняць сюжэт, просяць: "Зьдзелайце нам дубль, вот так вот разгаварівайце". Я кажу: "Калі ласка, папрасіце мяне па-беларуску, у нас тут такая гульня". "Это у вас гульня, а у меня работа". Пакрыўдзілася цётка й ня стала гуляць у гэтую гульню.

***Галіна:*** Праца без гульні – што гэта, калі не "работа"? Наўрад ці штось мастацкае. Гэнік, даўно насьпела пытаньне: а што для цябе ёсьць мастацтва?

***Гэнік:*** А што мастацтва? Зрабіў – ды й усё. І ня думаеш пра гэта. *(Сьмяецца)*. Мастацтва… — гэта стварацць нейкія формы, з цьвёрдай матэрыі, якія ўзьдзейнічаюць пасьля на нематэрыяльнае іншых людзей. Ствараць матэрыяльнае, якое дзейнічае ў нематэрыяльным сьвеце. І калі яно ўзьдзейнічае, значыць, гэта камусьці трэба… Вось мы і робім. Вось мы і ўкручаныя ў гэтае мастацтва, у стварэньне... Што такое мастацтва – ня ведаю...